
СК № 1
Mortui non mordent
№20
ВЯСКОВЫЯ МОГІЛКІ
МЕНСК 2002
МИНСК • 1997

# НАМ – 5!



## Віншаванне

Шаноўныя сябры!

Прыміце сардэчныя віншаванні з 5-годдзем з дня выхаду першага нумару часопіса “Вясковыя могілкі”. На працягу пяцігодкі калектыў “ВМ” плённа працуе на ніве сатурніянскай культуры.

Часопіс быў і застаецца своеасаблівым летапісам сатурніянскага пісьменства і друку. З часоў заснавання вакол выдання аб’ядноўваюцца лепшыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі Сатурна. На старонках выдання друкаваліся новыя творы Ланы Берасцянскай, Вінцука Адвячоркі, Сяргея Патаранскага, Віктара Ыванова, Пеці і г.д. У свой час Васіль Фірхольд назваў “ВМ” какай літаратуры і мастацтва Беларусі. І зараз на старонках “ВМ” адлюстроўваецца ўсё, што адбываецца ў нашай сатурніянскай культуры, а таксама ў культурах суседзяў з нашай і іншых сонечных сістэм.

Калектыў “ВМ” захоўвае ўсё тое горшае, што напрацавана ў мінулым, і шукае нагоды для новых паскудстваў у сваім прафесійным і творчым жыцці. Для многіх маладых аўтараў супрацоўніцтва з часопісам стала пачаткам іх літаратурнага канання. Хочацца спадзявацца, што калектыў рэдакцыі сваёй засметніцкай дзейнасцю, плённай працай і ў далейшым будзе ўносіць важкі ўклад у справу пахавання культурнай спадчыны краіны. Жадаю супрацоўнікам, аўтарам і чытачам часопіса добрага здароўя, творчага натхнення, поспехаў у жыцці і працы.

*Міністр дэзынфармоцыі планеты Сатурн Ынйаг-дап Ліахім.*



# НАВЕЧНА

Усе мы памятаем Джэці. Яе ваніты і дасюль саграваюць падлогу прыбіральні літінстытута ў Маскве (і толькі таму мы шчыра раім вам наведаць гэтае месца). Дынамік, які згарэў, ня вытрымаўшы яе голасу (і паралельнага галасу бабулек), клапатліва зберагаецца адміністрацыяй парку імя 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ейныя бінты – вечная згадка для ўсіх жывых пра тое, што з іх усіх калісьці рабілі муміі. А кожны сатурніянскі фетышыст носіць на шыі нітачку зь ейных трусікаў…



# Ў ПАМЯЦІ



Усе мы памятаем Леніна таксама. Ён з барадой, хоць з маладой гуляе дамай (ды ці ня быў бы ён занадта малады – бяз барады?). І доўга будзе тым любезны ён маньякам, глістам, нябожчыкам і розным какам, што іх у вершах апяваў дый пра кастратаў і дэбілаў не забываў. Аднойчы, стукнуты па макаўцы вядром, ён напісаў свой першы паліндром. Яго ўсе вельмі любяць на Сатурне (а хто ня любіць, - дурні!). І да ягонага ганебнага слупа "не зарастёт народная тропа"! А ён працягне тое, чаго і не спыняў. То ж посьпехаў яму вялікіх. Мяў!



Крый Божа вас забыць пра тое, што быў сярод нас і Нехта Трэці. Гераічны наведвальнік Літаб'яднання ў Доме літартарараў, баявы сябар гурта "Засралі казарму". Мяркуючы па афарыстычным верлібрыку "Я дурная, ты дурны, / І нашто нам дзеці?", гэта была жанчына, але запіс канцэрта ў клюбе "Pall Mall" запэўнівае, што вельмі мужная. Мы жадаем ёй, каб яна й надалей была такою, якою яна была, бо чалавек, з якім можна разважыць на траіх, – самы карысны чалавек у грамадзтве!

# НАРОДНАЙ…



Андрей Семёнов, г. *Солигорск*

## СТАРОСТЬ

Годы проходят – жизнь пролетает,
Что остаётся за нашей спиной?
Вера в добро нам помогает
Не умереть за глухою стеной.

Нам неподвластны капризы природы.
Молодость нам никогда не вернуть.
Где взять нам силы осилить невзгоды
И не упасть, распластавшись на грудь?

Люди, поймите, все мы не вечны!
И неизвестно, что в жизни нас ждёт.
Лучшие годы так быстротечны.
И не заметишь, как старость придёт.

## СОБАЧЬЯ ЖИЗНЬ

Бездомный, голодный и преданный другом,
Ты будешь скитаться ещё много лет.
И рухнув на землю, сражённый недугом,
Ты вспомнишь о счастье, какого уж нет.

Пока ещё молод – жизнь кажется раем,
Ни голод, ни холод тебе не знаком.
Но годы прошли, и становишься старым.
Хозяин прогнал, наградивши пинком.

Всмотритесь в глаза этой бедной собаки!
В них холод застыл и печаль.
Мы – люди разумные, мы не макаки!
Неужто бездомных не жаль?

Бродячие люди, бродячие звери –
Им так не хватает тепла!
Закрытые души, закрытые двери...
А жизнь, как вода, утекла.



Фотаздымкі аўтара, які сам прапана-
ваў іх як ілюстрацыі да сваіх вершаў

**Игорь Блоцкий**

ДОРОЖНЫЙ ЮМОР

Я помню страшное мгновенье –
Передо мной явился ты!
Я был в «приличном» опьяненьи
И не успел свернуть в кусты.

В глазах моих, как в сне чудесном,
Дорога вилась, как река,
Но у развилки, что за лесом,
Вдруг вырос облик мужика.

Я рассмотрел в анфас и профиль
Его чудесные черты –
Он жезлом тормознул мой «OPEL»,
И понял я, что мне кранты.

Забрал права лихой парнишка –
И неуместен был тут спор,
Чтоб дело не дошло до «вышки»,
Я бросил пить с тех самых пор.

* * *

Мы з табой даўно ў шлюбе,
Толькі вось адна бяда.
Ты гарэлку вельмі любіш,
Як шкада мне, як шкада.

Цябе выгнаў я із дому,
Не прыходзь і не шукай.
Замест зверскага напою
Ты піла бы лепей чай.

Ты згубіла ўчора грошы
І прыйшла зноў да мяне
- Мой ты любы, мой харошы,
Мо, пазычыш грошай мне!

- Ты хадзіць па барах будзеш,
А я грошы пазычаць,
А што потым скажуць людзі?
Не, такому не бываць…

# ВІНШАВАНЬНЕ

Дваццаты нумар!.. У ім я ня бачу ніякай сімволікі, хоць, як выкладчык, заўважаю лічбу “2”, і што яна ў нашай сістэме адліку паспяховасці азначае, вы, несумненна, ведаеце. Але… Не спяшайцеся з вывадамі, бо поруч стаіць знішчальны “нуль”. Што “нуль” азначае, вы таксама ведаеце: два і нуль, - о Божа! – як гэта радасна і як гэта насцярожвае…

Сёння я ўдзячны той картапляцыі зораў, пад якой нарадзіліся аўтары “Вясковых могілак” мінулых 20-ці нумароў. Тут зоры паспрыялі, як яны ніколі не спрыялі сатурніянскай маладой паэзіі, сатурніянскай маладой прозе, сатурніянскай маладой крытыцы. Спору ім, посьпехаў не толькі на старонках “Вясковых могілак”!..

Але тут я хачу сказаць і аб іншым: аб тым, што мяне палохае, аб тым, чаго я баюся. А баюся я празмернага спрыяння зораў цвінтаровай Беларусі, прабачце, Сатурну. Зоры баяцця знішчэння, зоры ўсцерагаюць: чым больш яны народзяць талентаў, тым менш шанцаў у талентазнішчальнікаў; тым больш шансаў могілкам, каб імі цвілі і ніколі не перацвіталі, прабачце, хавалі і ніколі не перахавалі і Беларусь паэтычная, і проста Беларусь, прабачце, Сатурн!..

І зноў, і зноўх прыканцы скажам: могілкі, яны – вынік плёну, а не сам плён. А вынік плёну – гэта рэальны вынік. І галоўнае – плёну няма без магілак, хаця ёсць магілкі поўныя і пустыя (гэтак званыя кенатафы). Да ні скляпоў, ні кенатафаў няма без могілак. Хочацца верыць, што крыжыкі дваццаці нумароў “Вясковых могілак” паўсталі, каб пустыя кенатафы талентаў набрынялі сапраўднымі мерцвякамі. Хочацца верыць, што не толькі зашмальцаванымі вянкамі засмуцяць нас “Вясковыя могілкі”, але і буйна закрасуюць свежымі курганамі і пірамідамі.

*Гэля Кайло.*





*Уладзімір Стасюк*

# ІНТЫМ МЫТНІ

А сепаратара п'еса
аб'ёмам – амёба

Хатка ў актах

**Анна** –
мадам
**Натан** –
аматар атама
і лам, эратаман, аматар эмалі

<u>Ткаў акт № 1</u>

Зала давыбараў, арабы, вадалаз.
Сыр. Баабаба абрыс.
Тут
Анна
і
Натан.





**Натан**
(матам):
Дзе баабаба аб'езд?
Дзе, зараза, раз'езд?

**Анна**
(але з'ела):
Тут.
Я, Анна, танная,
Увяла хана на халяву!

**Натан**
(тыпа запыт):
Марам хіба баб і хмарам
Матацца там?

**Анна:**
Дар баб – абрад,
А дар дзіцяці – здрада.

**Натан:**
Ага!
Тыповы вопыт!

<u>Ткаў акт № 2.</u>

Атола балота.
Драпае лысы леапард.
Анна
і
Натан





**Анна:**
Я
У
Яме цалавала цемя
Таты – цара цытат!

Натан:
У таты цалавала цытату –
А таты цю-цю цытата!




Анна:
У
Таты цытат
Тут
І
Там шмат!

Натан:
Акта ты цытатка!

Анна
(матам):
Сам такі! Ліс і сілікат мас!
Адагнутага рагатун гада –
Агалелага
Аратара-варатара!




Ткаў акт № 3.

Я і Сіма. Камісія.
Ружа баб. Абажур.
Яма лам'я
Аратара тара.
І
Тут
Анна
І
Натан




Анна:
А тэма мастака – масам, а самакат – самамэта…
Самамэта – тэма мас…
А тэма масы – самамэта…

Пісар асіп




Натан:
А ці здала, маладзіца,
Тыповы вопыт?

Анна:
Я і хімія,
Я і сесія,
А не здадзена.
Жах аж!

Анна
І
Натан:
Мара там – атарам,
Мара мас – амарам,
Мара фана – фарам,
Марам хіт і хмарам!

# УВАГА: ВІКТАР ЫВАНОЎ



**ПІВА (трагедыя)**

*Кватэра Г а р ш к о в а, 20:25, сябры сядзяць і гутараць пра сваё. Гульні тут жа, у кампутары.*

Г а р ш к о ў: А давай ты мне проста грошыкі аддасі, і будзем у разьліку.

К а з л о ў: А можа, лепей піва купім ы разам вып'ем?

Г а р ш к о ў: Не, лепей ты мне грошыкі аддай. Я не прашу зараз, можаш заўтра... як зьявяцца.

К а з л о ў: Не, ну разумееш, у мяне й зараз ё... Рэч у їншым. Я піва хачу.

Г а р ш к о ў: Дай лепей грошыкі.

К а з л о ў: Я хачу піва.

Г а р ш к о ў: Дай грошыкі лепей.

К а з л о ў: Я піва хачу.

Г а р ш к о ў: Дай грошыкі.

К а з л о ў: Піва хачу.



Г а р ш к о ў: Грошыкі.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Грошыкі.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Грошыкі.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Грошыкі.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Грошыкі.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Грошыкі.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Грошыкі.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Грошыкі.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Грошыкі.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Ну добра, піва дык піва.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Якое браць будзем?.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Сам разумею, што піва. Балтыку, крыніцу, аліварыю; балтыку шостую, восьмую, нулявую?

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Значыцца, возьмем крыніцу портэр.

К а з л о ў: Піва.

Г а р ш к о ў: Файнае піва. (націскае на слова файнае)

Казлоў: Піва.
Гаршкоў: Ты шо, зьдзекуесься?.
Казлоў: Піва.
Гаршкоў: Не выводзь мяне зь сябе.
Казлоў: Піва.
Гаршкоў: Яшчэ раз скажаш - руку паламаю.
Казлоў: Піва.
Гаршкоў (ламае Казлову руку): Піва.
Казлоў: Піва.
Гаршкоў: Піва.
Казлоў: Піва.
Гаршкоў: Піва.
Казлоў: Піва.
Гаршкоў: Піва.
Казлоў: Піва.
**УСЁ**





## ЗНОЎ УВАГА: КОМІКС ВІКТАРА ІВАНОВА




І ЯШЧЭ РАЗ: **УВАГА!** У ГЭТЫМ ЧАСОПІСЕ ЁСЬЦЬ **ВІРУС**! ВАРТА АДГАРНУЦЬ ЯГО ПОБАЧ ЗЬ ІНШЫМІ ВЫДАНЬНЯМІ (ДРУКАВАНЫМІ АБО НЕ), І ВІРУС ЗАРАЗІЦЬ ІХ. МЫ ВАС ПАПЯРЭДЗІЛІ — НАШЕ СУМЛЕНЬНЕ ЧЫСТАЕ.

Всего их было шесть
Тех, что меня в могилу уложили
И вы достаточно пожили
Кровава будет месть.





Безумный труп вдруг вышел на свободу
Живое мясо ест и Сатане в угоду
Сегодня ночью мёртвый вновь
Прольёт невинную младенческую кровь.

Жажда крови позвала меня
Веду мёртвых я в бой
Начинайся, резня
Начинайся, убой.

Я потискал твою грудь в упоенье
Я облизал твой задик в восторге
Если хочешь узнать мой

Из ада послал его
В гниющее тело, н
Нет радости жизн
Лишь крови жажд

УЗНИК, г.

Пасмурный день, дождь моросит
Энергию жизни сосёт паразит
Радости нет, счастья не видно
Жизнь незавидна, совсем незавидна.

Я ощущаю тихую печаль
Сейчас расстанемся, чудной
У горла твоего отточенная сталь
Прощай, ты сам тому виной.

Ласкаю дубовый твой
Вернись, дорогая моя,
С тех дальних мистич
Где скоро буду и я.





Да, и тебе, друг, предстоит попасть
На кладбище, прожив всуе
И ты изведаешь червей белёсых власть
Ты ощутишь их поцелуи.

Из царства теней пришёл тот злодей
Тот, у кого других нет идей
Покушать лишь мясо людское.
Выебать труп и оставить в покое.
Извиняюсь за неупотребное словечк



…в морге
Если хочешь узнать моё мненье,
Я рад, что работаю в морге.





По кладбищу стелется едкий туман
Он как наркотик, он как дурман
В тумане фигуры неясно видны
Они как мираж, как смутные сны.




С неба ливень сильный льёт
Труп в земле сырой гниёт
Дерево шумит ветвями
Гниль изъедена червями.

Mother Nature, так сказать.

…его Ариман
…о, но это обман
…жизни нисколько
…жда и только.

…г. Борисов

…вой гроб
…оя,
…тических троп,

The rain is dripping from the skies
The wind is howling in my ears.
The wind reminds me of my cries
The rain reminds me of my tears.

Ты от смерти не уйдёшь
Тебе некуда идти
Возьми лучше острый нож
Кровь себе пусти.






Отчаяние на моём лице
Я знаю всё об этом мертвеце
То друг мой лучший с юных лет
В руке сжимаю я стилет.

Хмурые люди за гробом идут
Голые ветви машут им вслед
Черви в могиле покойника ждут
Был человек и его больше нет.

…ечко.

Черви едят его труп
Теперь он мягок и нежен
А раньше часто был груб
И очень часто рассержен





СЕРГЕЙ ТРУНИН

# РАСПЛАВЛЕННЫЙ ГОРОД

*поэма-фрагмент*

ФРАГМЕНТ 1

Мой город тлеет,
плавится,
изменяется,
реинкарнирует новыми смыслами,
старыми сюжетами,
этими же настроениями
и тенями,
похожими друг на друга.

ФРАГМЕНТ 2

Духота –
всё та же
солнцезащитная ткань тишины,
гибнущей под колёсами
городского транспорта.

ФРАГМЕНТ 3

Ощущение смога глянцевым
туманом
Зелень плавится прежде чем нанести
оттенки
успевает
истекать потом с
водой незабвенной
однако не прочно
и взгляды мутнеют

ФРАГМЕНТ 4

Бережность звука тишины
зелёного пламени
воздуха твёрдого
киллера мягкого
Беги, не оглядывайся
чудеса настигают
и красота будет первой.

ФРАГМЕНТ 5

Плыви, плыви
по Неве
за мостом
разведут –
не оглянешься
не удержаться
под водой
под землёй
а солнце всё печёт и печёт.

ФРАГМЕНТ 6

Мученически изнывающая жара
это большое пространство
и воздух, который
пахнет историей.
Забывай –
уже слишком поздно.

ФРАГМЕНТ 7

Хватать –
это принцип сознания
Где-то Там
прячется узнавание –
оно как всегда улыбается…

ФРАГМЕНТ 8

Затмение памяти –
déjà-vu разбитых сердец
снежной бурей
морем песка
и звёздами,
усеявшими всё это.

КОДА

Ближе, ближе
плотнее, плотнее
держать расстояние
беглости взглядов –
расплавленность
превратилась в тотальность.

*Хирургические инструменты классического периода истории Древней Греции. Из коллекции Т. Мейера-Штейнега.*



**Зміцер План**

***

як цёпла і зялёна
і насычана
і крохка
зялёнае жэле
дрыжыць
на кончыках валос
на пазногцях
вырас мох
з вушэй
прабіваецца трава
я развальваюся
я крышуся
я правальваюся
у тваё вантробы
ты такая ж
прыгожая знутры
як і звонку

***

стагналі сцены
калі з месяца капала
кроў
бруілася неслася
у краіну нязнойдзеных
сноў
абрыньце непахіснае
маўчанне
якое гэта было гіпнатычнае
цурчанне
калі з месяца капала
кроў
калі з месяца капала
кроў
мая існасць
адмовілася ад
мрой
я адрэзаў свае
вушы
выкінуў прыгатаванае
сушы
калі з месяца капала
кроў
калі з месяца капала
кроў
я ўбачыў у сваім пакоі
на шпалерах
чырвонае масці
кароў
яны давалі крывавае малако
калі з месяца капала
кроў



**Игорь Клепиков**

***(ВзDRUGивая…)***

Если друг оказался вдруг
И не друг и не враг,
А DRUG,
Если сразу не разберёшь –
Плох он или хорош,
Ты присядь и глаза протри,
Проходящим вслед посмотри
Поездам…В суете колёс
Есть ответ. На любой вопрос.
Как вопрос он тоже любой
И как Ленин – всегда с тобой,
Словно всё – суета сует.
Светофор, эта LADY IN RED,
Тихо шепчет: ВЫХОДА НЕТ
В общем, друг оказался вдруг
И не враг и не друг,
А глюк…

«ДОРОГИЕ СООТЕЧЕСТВЕННИКИ!
Я видел Бога и стал
экстрасенсом»





А ↑ гэта нас нехта тэлеграмай павіншаваў

**Цемрык Велет**

РЭДАКЦЫЯ

Уваход у будынак зіхцеў запаскуджанымі дзвярыма. Дзверы рыпнулі. У нейкай кабінцы сядзеў вартаўнік:

- Мальчык…(нацягнуў акуляры) – Малады чалавек, чаго вы ўсё тут боўтаецеся. Ня спорціця шторы. То ж…Гэта жалюзі!

Га, ідзі ты! Прыступкі вялі наверх. Халера! Паляцеў. На скрыжаванні лесвіц усміхалася прыбіральшчыца, высоўваючы на мяне свае залатыя зубы. Каб ты здохла!

На дзвярах сумавала бляшка "Дзверы. Уваход па патрэбе". Я пагрукаў. Цішыня. Прыадчыніў:

- Маць вашу!..Колькі ўсім трэба казаць. Задзяўбло скразнякі знішчаць, хай іх ліха! Гемарой…

- Запаленне задняй кішкі… - прамармытаў я.

- Хто то? – занепакоіўся голас.

- Я то.

- Хто то "я то"?

Маўчанне. Я пракрочыў няўпэўненай хадой у пакой. Вока запесцілі брунатныя сцены. Пад сталом ляжала белая. Але брудная. Дыван у тым месцы таксама бялеў. У кутку святлеў жоўты. Мужык толькі злез з белай. Сумны малюнак.

- Прабачце, я прынёс вам рукапіс апавядання "Вяпла". Прачытайце, калі ласка.

Дзядзька паглядзеў на расшпіленыя штаны й на белую. Ізноў лёг на яе.

Рыпнулі дзверы.

Я дыхаў салёным паветрам




**Кася**

* * *

Тваe лісты. Тваё лісце. Твая лістота. Твой лістапад. Так зручна – таму што ты нежывы. Зрабіць шчасце – забіць шчасце. Ты вярнуўся. З унутрывеннымі ін’екцыямі песімізму ты трапляеш у мае жылы, каб заражаць мяне бездапаможнасцю. Каханнем да бездапаможнасці.

Часам я атрымліваю нерукапшсныя лісты з восьмага вымярэння.

Я выглядаю значна прыгажэй, калі глядзець праз ледзяныя кубікі слёз. Так натуральней.

Мой новы дом размешчаны на ўскрайку існавання. Твой новы дом размешчаны на межах маёй істоты. Закрэслі мае думкі фіялетавым алоўкам. Восьмае вымярэнне выключае каханне?

**Иван Литвинов,** *г. Могилёв*

ИСТОРИЯ,
которая произошла с одноклассниками автора – Олегом и Сашей.

Шли они как-то вместе домой, и по дороге Саше попал в ботинок камушек. Какая при этом ходьба – сами знаете. Чтобы освободиться от назойливого минерала, Саша остановился у железобетонного столба, облокотился на него и стал трясти ногой, чтобы камушек вылетел. Лицо его при этом было искажено недовольством. А мимо проходил человек с палочкой. Смотрит, держится пацан за электроопору, лицо перекошено, нога дёргается. Ясное дело, под напряжение попал. Ну и саданул палкой по руке, чтобы, значит, отсоединить его от тока.

Олег, наблюдавший эту картину издали, чуть не упал со смеху. А Саше, понятное дело, было не смешно. Но сейчас, глядя на синяк на руке, он не может сдержать улыбку. Дескать, хорошо, что не головой о столб опирался.

---

## Зьмест


Нам – 5! .......... 2
Навечна ў памяці народнай... ---3
Андрей Семёнов
Старость ------4
Собачья жизнь ---4
Игорь Блоцкий
Дорожный юмор--5
Мы з табой даўно ў шлюбе...---5
Уладзімір Стасюк
Энтым мытні ---6
Віктар Іваноў
Піва (трагедыя)---8
Тайна п'янага мутанта (комікс) 9
Узник
Стихотворения...10
Сергей Трунин
Расплавленный город ----12
Зміцер План
Стагналі сцены... --------13
Я цёпла і зялёна... ------13
Игорь Клепиков
(ВзDRUGиВая...) --------13
Цемрык Велет
Рэдакцыя -----------14
Кася
Твае лісты... ---------14
Иван Литвинов
История... --- --- ----15
Наталька Базылевіч
Вершы і лімерыкі ----16
Віктар Жыбуль Нацюрморт наадварот ------17
Джэці Беражэце зубы! ---17
Віка Трэнас Эдыёма ідэала--17


Толькі незразумела, навошта гэты зьмест: старонкі ж не пранумараваныя.

і нештачка яшчэ...

## ВІНШАВАНЬНЕ

Вы спытаеце: "Што такое для мяне "Вясковыя могілкі"?" А ведаеце – многае! Па-першае, гэта – мая літаратурная зямля, тая, што прыняла мяне адразу і скіравала ў апошні шлях. Па-другое, я лічу, што гэты часопіс патрэбны ўжо хаця б дзеля таго, каб пахаваць творчую спадчыну аўтараў-канчаткоўцаў. Так, нават дзеля гэтага!

Шкада, што ён, гэты часопіс, з'явіўся на свет усяго толькі пяць гадоў назад. Але ці былі б "Вясковыя могілкі", калі б пра іх не парупіліся стогадовая Мівее Еевім? І дзе б яны былі ўжо тады, калі б за іх не ўзялася Джэці? А яе памкненні праз чатыры гады падтрымаў Ленін, а праз чатыры з паловай - Нехта Трэці! І вось мы маем тое, што мы маем. Я ўпэўнены, што сярод вясковамогілкаўцаў ёсць будучыя гуры, фурыі і парыі, якія некалі з агідай успомняць, што іх першыя творы былі надрукаваныя ў "Вясковых могілках". І таму я з радасцю і шчыра, ад усяе душы, жадаю аўтарам і калектыву рэдакцыі "Вясковых могілак" плённай працы на карысць нашай планеты.

Жыве Сатурн!

*Васіль Фірхольд.*



Адзін файны хлопец з Лучыны
Хацеў стаць сапраўдным
мужчынам,
Ды як - ён ня знаў
І кніжкі чытаў
Пра слаўных герояў Айчыны...

Ад хлопца аднога з Гікала
Дзяўчына ўвесь час уцякала,
Аднойчы дагнаў
Па шыі ей даў,
Але было гэтага мала.

Адзін хлапец з Салігорску
Зарос барадой і каростай -
Бо да перамогі
Ня мыць нават ногі
Зарок даў у часе зуброўства.



Адна дзяўчына зь Бялпаку
Любіць пляткарыць у чатах,
Начамі сядзіць,
НЯХАЙ, што баліць
Язык, вочы, пальцы і срака!



Адзін філёзаф зь Нямігі
Гучна смаркаўся і чыхаў,
Усім ён мяшаў,
Ды перапрашаў,
Бо ветлівым быў, як на ліха.



TUT.BY
БЕЛОРУССКИЙ ПОРТАЛ

**Наталька Базылевіч**



Ой вы дзевачкі, беларускія,
Не хадзіце ў Хатку гуляць,
Бо ў Хатцы хлапцы
Усе жанатыя,
У заблуджэньне прыводзяць дзяўчат.
Адна дзевачка, раскрасавіца,
Прызывалася неяк яна
Улюбілася ў хлопца з Хаткі
І ня знала, што дома жана.
Позьні вечарам ў Хатку Глот прыйшоў
Падарыў ёй флэшку адной
Забірай усё, ўсё што ёсьць в цібя
І хадзем ў прыватны пакой.
Да пакою йшлі, цалаваліся,
Любавалісь сабой, как маглі,
Даў ён цікенька ёй пасворд ня той,
Сказаў пару мінут абажджы.
Вспомніл пра сям'ю, пайшоў ў айсік'ю
І празрыцельна смотрыт ўв ан-ляйн.
Дасьвіданія, больш ня ждзі міня,
У мяне ў Хатцы ёсьць дзеці-жана.
І асталася та дзяўчыначка.
З паралём ня тым у руках
Аблілась сьлязой, і пайшла ў афляйн.
Так прашлі маладыя гада.





Не кусай ты мяне залатымі сваімі зубамі,
Не цягні за язык, я ж цябе за язык не цягну,
Я ня здольная зараз сваімі варушыць губамі,
У мяне мала часу сягодня, любві і агню....



*Віктар Жыбуль*

**НАЦЮРМОРТ НААДВАРОТ**

Прысяду, кучу навалю я,
патрэбе здадзены ў палон,
а нехта прыйдзе, намалюе
маіх патугаў сьціплы плён.

Карціну акальцуюць рамай,
каб у музэй яе аддаць.
А я прыду туды таксама
і буду з гонарам казаць,

што нездарма наклаў я кучу,
што сёньня – ейны зорны дзень
і што нязгасны й неўміручы
мастацтва вольнага агмень.

*Джэці*

**БЕРАЖЫЦЕ ЗУБЫ!**

Я ў мыкала ў трубку старанна
З усьмешкаю скрыўленых губ,
І ты зразумееў, мой каханы,
Што сёньня мне вырвалі зуб.

І я засталася бяз зуба.
Цяпер ён чакае мяне
Ў тым месцы, дзе мы з табой, любы,
Бываем пакуль толькі ў сьне.

А сьніцца нам змрочная сьцежка,
І зорачкай зьзяе над ёй
Дзявоча-бяззубая ўсьмешка
З прыгожай і чыстай душой.




*Віка Трэнас*

**ІДЫЁМА ІДЭАЛА**

на зімовае сонца вочы прымружыўшы
прапускае святло ў душу праз сінія зрэнкі
чарнавокі спадар што імкнецца сябе сагрэць
ён бялейшы за першы снег і крылы анёлаў
я гляджу на яго і моўчкі кусаю вусны
толькі хто вінаваты мой любімы колер – чырвоны
устрывожаны ранак птушкай сарваўся з галіны
дай пад'есці свабодзе трошкі апалага лісця
дайце мне пад'есці трошкі вашай свабоды
маё сэрца стане вялікім як гэтыя вочы

*ЛЕНІН І ДЖЭЦІ*



## ВІТАЙЦЕ РУЙНАВАЛЬНІКАЎ!

Менск трэбы захоўваць, захоўваць! Але дзеля ягонага захаваньня ці ня варта штосьці й зьнесьці? Мы чулі адну прапанову (дарэчы, ад аўтара толькі што выказанай думкі) – зьнесьці помнік Жалезнаму Феліксу насупраць КДБ. Наконт гэтага трэба яшчэ падумаць – нам шкада неяк Фелікса. Можа, аднесьці лепш яго куды – да Камароўкі, напрыклад, або да дзяўчынкі з парасонам? Там яго самі нашыя грамадзяне на кавалкі расьцягнуць. Бо яны – гэта ўжо лёс…

Але сама думка руйнавальная нечакана нам спадабалася. І вось мы склалі свой сьпіс, што трэба зьнесьці і што мы адразу зьнясем, як даведаемся, што здолеем. Палюбуйцеся, можа яшчэ й дапамагаць прыйдзяце(або яшчэ што дадасьце):

1) вул. Няміга, дамы № 6-14;
2) вул. Няміга, McDonalds;
3) прасп. Машэрава, гатэль "Юбілейны";
4) вул. Мясьнікова, Лукойл;
5) вул.Калектарная, банк;
6) пл. Свабоды, шэры гмах (ён там пакуль адзін такі);
7) Кастрычніцкая пл. (здагадайцеся самі з трох разоў – што);
8) вул. Камуністычная, д. 86 (гатэль "Беларусь");
9) вул. Лодачная, новы гмах;
10) пл. Свабоды, кавярня "Пінгвін";
11) вул. Беларуская (тое, што там зараз будуецца);
12) Дом міласэрнасьці (што ў лесе каля ст. М "Усход");
13) новая нацыяналка (вось шкада, нельга вярнуць час назад, каб яшчэ захаваць 4-ы Сьляпнянскі завулак… А нов. нац. будаваць ня трэба!)
14) вул. Замкавая, "12 стульев";
15) вул. Дзімітрава, новы дом;
16) вул. Шпалерная, д. 4;
17) вул. Старажоўская, д. 8;
18) Казарменны зав., д. 4;
19) вул. Прытыцкага, д. 27 (Лядовы палац);
20) вул Багдановіча, д. 55.

Можа, мы яшчэ пра што забыліся – дык дададзім пасьля. І калі б гэта ў нас проста так рукі сьвярбелі! Не, мы можам пераканаўча патлумачыць, чаму трэба зьнесьці кожны з гэтых дамоў. Толькі сьпяшацца пакуль ня будзем. А раптам яны напалохаюцца дый самі разваляцца, якраз у той момант, калі ні ў іх, ані побач нікога ня будзе! А патлумачыць – вы толькі запытайцеся, мы адразу. Калі гэтыя тлумачэньні наогул спатрэбяцца…

**ГРИГОРИЙ ТИСЕЦКИЙ "НЕМОЙ ПОЭТ". П'еса.**

Грыгорый Цісецкі – хлопец, безумоўна, таленавіты. Ён, мяркуючы па артыкуле ў газэце "7 дзён", цалкам нармалёва для свайго ўзросту разважае пра тое, як уладкаваны сусьвет, марыць, каб там усё было добра й зьмянялася да яшчэ лепшага. Не пазбаўлены Грыша й літаратурнага таленту, хаця абвяшчаць яго геніям ці не занадта рана? А тым больш недарэчна – лаяць хлопца, які ў сваёй п'есе прывёў ледзь не стэнаграму тыповай гутаркі нашых шаноўных пісьменьнікаў – тых, для якіх "пісьменьнік" – гэта сацыяльны статус і ўвогуле нешта, за што іх трэба паважаць і карміць. Вось паважаныя на Грышу й пакрыўдзіліся – значыцца, пазналі. З пазнаваньнем у іх наогул добра, таму цяпер яны сапраўдныя суслікі-купалаеды – і самі вінаватыя.

Аднак хопіць пра гэтых добрых людзей – няхай яны будуць здаровыя й маюць усё, што ім трэба – гэты артыкул быў распачаты, каб паглядзець бліжэй на Грышаву п'есу. Яна ўжо вядомая досыць шырока: у інтэрнэце вісіць, нават абмяркоўвалася на нейкім нэтаўскім семінары, зладжаным далёка за межамі Беларусі; чыталі яе й паважаныя пісьменьнікі, якія потым на Грышу лаяліся; чытала й тая цётачка, што ў "Сямі днях" з Грышам размаўляла. Людзі зь семінара ацэньваюць п'есу як нешта "жудасна постмадэрновае", журналістка з газэты асабліва адзначае сцэну прэпараваньня Купалы; мы вось таксама прачыталі й вырашылі выказацца.

Хаця насамрэч у літаратуры й наогул у сьвеце ўсё патрэбна, і п'еса Грышы, менавіта такая, якая яна ёсьць, - таксама. І тым ня менш…

На наш погляд (добра, на мой – R-715-ўскі), п'еса як абяцаньне вельмі цікавая, але недастаткова сталая, каб вызначаць, у межах якога літаратурнага напрамку яна створана і г.д. Перадусім, нават нягледзячы на тое, што аўтар перадпасылае ёй тлумачэньне, маўляў, ён піша на рускай мове, бо яе ведае, а беларускай ня ведае, ён і ў рускім тэксьце выхітраецца нарабіць памылак, па большасьці пунктуацыйных. Далей: некаторыя месцы ў п'есе беспадстаўна цьмяныя, і чалавеку (прынамсі, не знаёмаму з Грышам) іх зразумець ніяк немагчыма. Ці дапушчальна такое ў творы, адрасаваным мільёнам (а патэтыкі там не тое што на мільёны – на мільярды чытачоў хопіць і на мільярды твораў таксама)? Узнікаюць пытаньні й да вызначэньня жанру, бо часта тое, што пазначана Грышам як п'еса, вельмі ўжо нагадвае нейкі кінасцэнарый. Кінасцэнарыі Грыша пісаў, але тэатр і кіно – розныя рэчы. Паспрабуй, напрыклад, пакажы на сцэне хоць бы такое: "Шумная улица с множеством прохожих, идущих куда-то по вымощенным плиткой дорогам, с цыганами и бомжами, просящими милостыню, с музыкантами, перебирающими плохо натянутые струны". Што ж гэта, сцэну пліткай абкладваць? А "дрэнна нацягнутыя струны" – ці чуў Грыша калі-небудзь, як гучаць дрэнна нацягнутыя струны? Пад такі саунд нават ня кожны панк сьпяе. Але больш за ўсё Грышу шкодзіць галоўны герой – Купала. Як толькі ён зьяўляецца (а гэта здараецца даволі часта), усе персанажы адразу апынаюцца ці то на хадулях, ці то зусім ужо на мыліцах і пачынаюць вярзьці й рабіць розныя недарэчнасьці. А як мягчэй вызначыць садысцкае зьбіваньне Купалы кавалкам вяроўкі, якое немаведама для чаго зьдзяйсьняе купалава ж муза (што, Купалу так ужо муза крыўдзіла? Вось, значыцца, адкуль знакаміты ляўкоўскі цыкл!..)? Наогул, нейкая ў яго мэлядрама з музай… А канібальскія сцэны з грузінамі й жабракамі – ці не зашмат камэнтарыяў да іх спатрэбіцца нашым сярэднім розумам? А тое ж трыбушэньне Купалы "трэцім пісьменьнікам"? Прыгадваецца Коркія, які ўдала "замуміфікаваў" Сталіна, але тое ж Сталін, які й сам быў муміяй, і паралеляў да ягонага муміфікаваньня адразу шмат прыгадваецца. А тут – Купала… Дзіўна неяк – пошук душы ў жываце. Але газэтных цётачак кранае. Значыць, нешта ўсё ж такі ўгадваецца. Толькі вельмі цьмянае – не разумееш, чаму тут радавацца, пра што сумаваць. Яшчэ часта аўтар кранальна называе Купалу проста Янкам, напрыклад: "третий писатель (вспарывает Янке брюшину)". Гэта міла.

Мне здаецца, Грыша вельмі блізкім сябе пачувае да свайго змардаванага героя. Таму што той – "не зразуметы". Далейшыя разважаньні пакінем, аднак, пры сабе. Бо ўсё ж такі радуе, калі аўтара так моцна хвалюе тое, пра што ён піша. А Грышу хвалюе відавочна. І адна моцная сцэна ў ягонай п'есе дакладна ёсьць – тая, дзе пісьменьнікі размаўляюць пра нацыянальнасьці, да таго месца, дзе з'яўляецца Купала. Праблемы ў творы таксама важныя ўздымаюцца: моўная, яшчэ пытаньне пра адносіны сучасных людзей да мастацтва і інш. Але форма, у якой усё гэта вырашаецца, пакуль недасканалая. Ну хіба не? Нам, значыцца, застаецца Грышу пажадаць, каб у яго было шмат посьпехаў на гэтым шляху й яшчэ каб на яго паменш лаяліся й не хвалілі нізавошта. Бо гэта таксама шкодзіць.

*R-715*

# ВРЕМЯ ВЫБИРАТЬ!



## SUPERBEQUEM, VOLLELASTISCH, SANFT FO…











**1 Drei superelastische Miederslips in einer Packung,** champagner + schwarz + weiß. Aus 85% Polyamid, 15% Elasthan.

3 Stück ab 29.95

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 Pckg. (3 St.) 359 196 | | | |
| 65,70,75,80,85 | 29,95 | 90,95 | 32,95 |

**2 Preiswert! 4 Miederslips in einer Packung,** 2× weiß + 2× schwarz. Aus 85% Baumwolle, 13% Polyester, 2% Elasthan.

| | |
|---|---|
| 381 036 | 34/36,38/4 |
| | 29,95 |

ИЛИ

…nte …er …% …an.

2 Stück ab 29.95

| | | | |
|---|---|---|---|
| …357 | | | |
| | 29,95 | 90,95 | 32,95 |

**4 Angenehm zu tragen: zwei superleichte Miederslips in einer Packung,** weiß + schwarz. Aus 80% Polyamid, 20% Elasthan.

2 Stück ab 34.95

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 Packung (2 Stück) | | | 692 500 |
| Gr. 65,70,75,80,85 | 34,95 | 90,95 | 37,95 |












2 Stück ab 29.95

SparPreis 4 Stück ab 49.95

Sie sparen 9.95

**5 Miederhöschen** aus 80% Polyamid, 20% Elasthan. 2-Stück- und als 4-Stück-Spar-Pckg.!

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2 Stück (weiß+schwarz) | | | 692 522 |
| 65,70,75,80,85 | 29,95 | 90,95,100 | 32,95 |
| 4 Stück (2×weiß+2×schwarz) | | | 470 875 |
| 65,70,75,80,85 | 49,95 | 90,95,100 | 54,95 |

**6 Vollelastische Miederhose mit extra hohem Taillenband.** Aus 75% Polyamid, 25% Elasthan. Vorderteil verstärkt.

ab 29.95

petite fleur

| | | | |
|---|---|---|---|
| weiß 353 527 | | haut 353 536 | |
| Gr. 70,75,80,85 | 29,95 | 90,95,100 | 32,95 |

**7 Miederslip mit kreuzförmigen Verstärkungen.** Schritt mit Baumwollzwickel. Aus 81% Polyamid, 19% Elasthan. In 2 Farben.

ab 39.95

Playtex Zauberkreuz

| | | | |
|---|---|---|---|
| champagner 352 134 | | weiß 352 514 | |
| 65,70,75,80,85 | 39,95 | Gr. 90 | 43,95 |

**8 Zwei formkräftige Miederslips in 1 Packung,** weiß + haut. Vollelastischer Jacquard aus 85% Polyamid und 15% Elasthan.

2 Stück ab 39.95

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 Packung (2 Stück) 352 010 | | | |
| 65,70,75,80,85 | 39,95 | 90,95,100 | 43,95 |



